У лесе вясна. Звераняты павыходзілі са сваіх хатак і сабраліся на беразе возера.

— Зірніце! Ластаўкі ўжо вяртаюцца з выраю! Мне б так хацелася ўмець лятаць, як яны! — усклікнула Вавёрачка.





— А Суперчарапашка ўмее лятаць, як ластаўкі! — адказаў Яноцік.



— Суперчарапашкі не бывае! — запярэчыў Трусік.

— А вось і бывае! І, апроч таго, яна мая сяброўка! — пахвалілася Лісяня.





Лісяня расказала, як Суперчарапашка дапамагла яму аднойчы выратаваць Вожыка з зыбучых пяскоў, а яшчэ — вызваліць Верабейку з гіганцкага павуціння.

— Ты сапраўды сябруеш з Суперчарапашкай? — спыталася Вавёрачка. — Раскажы нам што-небудзь яшчэ пра яе!

— Суперчарапашка лятае ў небе, як арол, і яна моцная, як цмок, — паведаміла Лісяня.

